# Да фестывальнага лета — гатовы!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першая чарга маштабнай рэканструкцыі гасцініцы «Віцебск» завяршылася яшчэ напрыканцы чэрвеня, першымі гасцямі абноўленага комплексу сталі ўдзельнікі XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ад ранейшай гасцініцы, пабудаванай у 1973 годзе, якая лічыцца сімвалам паўночнай сталіцы, засталіся толькі сцены. Увесь нумарны фонд, камунікацыі, інтэр'ер абнавілі цалкам. Уваходная група з новымі дзвярыма рэвальвернага тыпу і хол са стойкай адміністратара выглядаюць сучасна і стыльна. Фасад дапоўнілі элементамі са шкла: вялікія вокны ў ліфтавых холах, адкуль госці змогуць палюбавацца відам на набярэжную Заходняй Дзвіны, Нацыянальны акадэмічны драмтэатр імя Якуба Коласа, Кіраўскі мост. Ва ўсіх холах усталявалі мяккія крэслы і канапкі, каб гасцям было зручна адпачываць не толькі ў сваіх нумарах. Уся новая мэбля ў гасцініцы выраблена віцебскімі прадпрыемствамі! Рэстаран гасцініцы цяпер разлічаны на 116 месцаў. Пасля «Славянскага базару ў Віцебску» гэты пункт грамадскага харчавання ў другой чарзе

рэканструкцыі дапоўняць летняй тэрасай з асобным уваходам. У невялікай колькасці ў «Віцебску» прадстаўлены і сямейныя нумары з двух пакояў, здольныя даць камфортнае жыллё бацькам з дзецьмі. Не забыліся і пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі: для іх асобна абсталявалі шэсць нумароў, стварылі камфортнае безбар'ернае асяроддзе і пашырылі пасажырскія ліфты. Вельмі змянілася і тэрыторыя вакол: павялічылася стаянка для аўтамабіляў, з'явілася новая стаянка для турыстычных аўтобусаў, а старыя дрэвы замянілі сучасныя клумбы з новымі раслінамі, стыльныя лавачкі.

Канцэртная зала «Віцебск» — адна з галоўных пляцовак фестывалю разам з Летнім амфітэатрам. Сёлета ўдзельнікі і госці XXXIII Форуму мастацтваў змогуць ацаніць на свае вочы, як моцна змяніўся не толькі знешні, але і ўнутраны выгляд пляцоўкі. Акрамя сучаснай круглай залы, дзе падчас «Славянскага базару» будзе размяшчацца Міжнародны прэс-цэнтр, новых харэаграфічных класаў, у КЗ з'явілася вялікая швейная майстэрня з прафесійным канвеерам. Новы выгляд набылі дзве арт-прасторы, дзе можна выпіць кавы. Добраўпарадкавалі і тэрыторыю каля канцэртнай залы: стварылі новы сквер, для зручнасці наведвальнікаў спраектавалі дадатковую стаянку ўнізе, акрамя таго, пабудавалі новую лесвіцу пад нумарам 18. Падчас рэканструкцыі аб'екта на аздабленне КЗ спатрэбілася больш чым кіламетр святлодыёднай стужкі, 16 тысяч квадратных метраў керамаграніту. Адной з «разынак» адкрытай залы стаў каляровы паркет з беларускім арнаментам. На рэканструкцыю аб'екта было накіравана каля 40 мільёнаў рублёў.

Абнаўленні ў такі святочны і насычаны падзеямі для Віцебска год закранулі і самую вялікую ў Беларусі плошчу Перамогі. Тут з'явіліся тры доўгачаканыя фантаны, аналагаў якім пакуль няма ў Беларусі. 118 бруй, якія могуць дасягаць пяці метраў у вышыню, падсвятляюцца і могуць «танцаваць» пад тэматычныя музычныя кампазіцыі. Два стацыянарныя святлодыёдныя экраны, да якіх жыхары абласнога цэнтра ўжо прывыклі, замянілі на сучасныя. На жылым будынку, які выходзіць на плошчу Перамогі, абнавілі надпіс «Подвиг советского народа бессмертен!» і ўзнялі копію Сцяга Перамогі. На мемарыяльным комплексе ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны ўстанаілі падсветку, якая праецыруе на тры абеліскі колеры нацыянальнага сцяга. На будынку па адрасе: вуліца Белабародава, 5, які таксама выходзіць на плошчу, працуе падсвятленне.

Віцебскі Зелянбуд падрыхтаваў гораду звыш мільёна кветак: цынерарыі, газаніі, тагецісы, колеусы, лабеліі, вяргіні — далёка не поўны пералік назваў раслін, якія ўпрыгожваюць горад. Ужо класічныя каляровыя «рэкі» з петуній «бягуць» па плошчы Свабоды, раздзяляльнай зоне на Маскоўскім праспекце. А кветнікі на плошчы Перамогі сёлета ўпрыгожваюць зоркі ў гонар 80-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры горада з'явіліся новыя арт-аб'екты са штучнай травы, якія ўжо сталі папулярнымі фотазонамі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота аўтара.**

# ЖЫЛЛЁ З ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ, СКАРАЧЭННЕ ДАЎГАБУДАЎ І ЛАЯЛЬНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Абмеркавалі і меры, якія прымаюцца па скарачэнні колькасці жылых дамоў, лецішчаў, будаўніцтва якіх не завершана і не законсервавана. На парадку дня — і адчужэнне жылых дамоў у сельскай мясцовасці, удасканаленне работы з пустымі дамамі, крэдытаванне фізічных асоб, у тым ліку за кошт выдзялення ім мікрапазык, а таксама павышэнне ўзроўню абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Традыцыйна ў абмеркаванні прыняло ўдзел шырокае кола экспертаў.

Што датычыцца аказання грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры ўзвядзенні, рэканструкцыі або набыцці жылля, Старшыня Савета Рэспублікі лічыць, што трэба зрабіць зручны і зразумелы дакумент — пакетным прынцыпам. «Гэта будзе нядрэнны нарматыўны прававы акт, але мы павінны разумець, для чаго ўносім гэтыя праўкі, — заўважыла Наталля Качанава. — Мы ўносім гэтыя праўкі, каб улічваць меркаванне мясцовых органаў улады, якія сёння бачаць шэраг праблем у сферы будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Хтосьці не можа ўзяць крэдыт, бо ў яго ёсць лецішча ў сельскай мясцовасці (яно ўлічваецца, і ты ўжо не маеш патрэбу ў жыллі), або табе налічаць такую суму, што ў чалавека няма такой магчымасці. Таму нам трэба выходзіць з трох асноўных пасылаў. Найперш для чаго мы ўносім гэтыя праўкі? Для таго, каб людзі маглі будавацца. Асабліва ў рэгіёнах, малых населеных пунктах. Бо такая наша палітыка, накіраваная на рэгіянальнае развіццё. Таму, выходзячы з гэтай задачы, нам трэба выходзіць і з таго, што скажуць калегі, якія працуюць на месцах, бо мы разумеем, што ёсць праблемы. Калі мы хочам будаваць жыллё ў малых гарадах і замацоўваць там спецыялістаў, мы павінны ствараць там умовы».

Як паведаміў у размове з журналістамі **міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ**, на экспертным савеце разглядаліся змяненні ў шэраг указаў: у прыватнасці, Указ № 13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў», Указ № 240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў» і Указ № 215 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні будаўніцтва (узвядзення, рэканструкцыі) жылых памяшканняў».

«Варта раздзяляць падыходы аб фарміраванні жыллёвай палітыкі і ўнясенне змяненняў ва ўказы, — звярнуў увагу міністр. — Сёння мы абмяркоўвалі канкрэтныя даручэнні кіраўніка дзяржавы аб неабходнасці дадатковай падтрымкі шэрагу катэгорый пры будаўніцтве жылля ў малых населеных пунктах і сельскай мясцовасці. Новаўвядзеннем з'яўляецца тое, што ўзмацняецца дзяржаўная падтрымка маладых сем'яў пры будаўніцтве жылля ў сельскай мясцовасці, маладых спецыялістаў, якія толькі пачалі асвойваць сваю прафесію ў такіх населеных пунктах».

Дарэчы, экспертны савет пры Савеце Рэспублікі працягвае работу ў абноўленым складзе. З пачатку восьмага склікання на яго разгляд паступіла каля дзесяці найважнейшых дакументаў, сярод якіх — праекты законаў «Аб змене законаў па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх», «Аб змене законаў па пытаннях ветэранаў», «Аб змене законаў па пытаннях адукацыі», «Аб лізінгавай дзейнасці» і інш. Вынікі праведзенай работы пацвярджаюць, што функцыянаванне дадатковага экспертнага «фільтра» дазваляе прымаць узважаныя і абдуманыя рашэнні, усебакова разглядаць прапанаваныя навацыі і ацэньваць патэнцыяльныя рызыкі ад іх рэалізацыі на практыцы.

Усяго за ўвесь перыяд дзейнасці (з чэрвеня 2021 года да цяперашняга часу) экспертным саветам разгледжана больш за 260 дакументаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

Весткі з Кітая

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ЗЯЛЁНЫМ РАЗВІЦЦІ

## У Цындаа адкрыўся Форум ШАС

**Форум краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва па зялёным развіцці адкрыўся ў прыморскім горадзе Цындаа, што ў правінцыі Шаньдун на ўсходзе Кітая.**

**Тэма глабальнага мерапрыемства, на якое з'ехаліся прадстаўнікі дзясяткаў краін, — «Крочыць па шляху зялёнага развіцця поруч, прасоўваць гарманічнае суіснаванне чалавека і прыроды». Форум насамрэч гістарычны для нашай краіны — упершыню яна ўдзельнічае ў якасці паўнамоцнага члена ШАС, які набыла літаральна некалькі дзён таму. Генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Мін шчыра вітаў наша далучэнне да прадстаўнічай «сям'і ШАС», якая цяпер аб'ядноўвае звыш трох мільярдаў чалавек. Нагадаем, што Беларусь стала дзясятай дзяржавай — членам глабальнай арганізацыі.**

Як заўважыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Іван ПРЫХОДЗЬКА**, вельмі важна слухаць і чуць адзін аднаго — ШАС дае такую магчымасць. У нашай краіне пабудова «зялёнай» эканомікі сярод асноўных дзяржаўных прыярытэтаў. Вялікая ўвага аддаецца пашырэнню найноўшых тэхналогій, якія дазваляюць зменшыць уздзеянне вытворчай дзейнасці на прыроду. «У Беларусі актыўна развіваюцца электратранспарт і адпаведная інфраструктура, пашыраецца зялёнае будаўніцтва, адбываецца лічбавая трансфармацыя эканомікі», — падкрэсліў Іван Прыходзька.

Старшыня КНР Сі Цзіньпін накіраваў віншавальны ліст удзельнікам форуму краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Кітайскі лідар адзначыў, што ахова экалагічнага асяроддзя і садзейнічанне зялёнаму развіццю — гэта кансэнсус краін ШАС. У апошнія гады КНР прытрымліваецца канцэпцыі «Празрыстыя воды і зялёныя горы — бясцэнны скарб», захоўваючы прыхільнасць шляху цывілізаванага развіцця, які характарызуецца развіццём вытворчасці, заможным жыццём насельніцтва і здаровай экалогіяй, дзякуючы чаму ў будаўніцтве «выдатнага Кітая» былі дасягнуты велізарныя поспехі, якія прыцягнулі ўвагу ўсяго свету.

КНР спадзяецца на нарошчванне абменаў і супрацоўніцтва з усімі бакамі ў галіне зялёнага развіцця праз цяперашні форум, каб садзейнічаць устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю ўсіх краін і гарманічнаму суіснаванню чалавека і прыроды. Сі Цзіньпін нагадаў, што Кітай днямі прыняў ратыфікацыйнае старшынства ў ШАС, якая служыць узорам новага тыпу міжнародных адносін і рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Як заўважыў старшыня КНР, Кітай гатовы працаваць з усімі бакамі, каб развіваць «Шанхайскі дух», умацоўваць згуртаванасць і ўзаемадзеянне, садзейнічаць зялёнаму развіццю, агульнымі намаганнямі ствараць новы раздзел агульнага развіцця і сумесна будаваць яшчэ больш цесную супольнасць адзінага лёсу ШАС.

Ініцыятыва правядзення тэматычнага форуму па зялёным развіцці належыць Сі Цзіньпіну, які вылучыў яе летась. 2024-ы на прасторы ШАС абвешчаны Годам экалогіі, што падкрэслівае важнасць міжнароднага супрацоўніцтва па адпаведным трэку. Як адзначыла намеснік старшыні Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага касультацыйнага савета Кітая, старшыня Кітайскага камітэта ШАС па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве Шэнь Юэюэ, зялёнае развіццё стала новым драйверам імклівага руху Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Актуальны кірунак спрыяе эканамічнаму росту дзяржаў вялікай «шанхайскай сям'і», а значыць, паляпшаецца дабрабыт людзей.

Гэта адказ на сур'ёзныя выклікі сучаснасці, якія звязаны са змяненнем клімату і пашырэннем прыродных катаклізмаў. Яны ў тым ліку прыводзяць да змяншэння водных рэсурсаў і праблем з забеспячэннем харчаваннем. Як заўважыў Чжан Мін, проста жыццёва неабходна наладжваць плённае супрацоўніцтва ў галіне экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя. На форуме была прынята ініцыятыва аб стварэнні партнёрскіх адносін па зялёным развіцці ў мэтах сумеснага прасоўвання ўстойлівага развіцця.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,**

*г. Цындаа, Кітай.*

Размова па сутнасці

# Аснова адзінства — у захаванні разнастайнасці культур і канфесій

## У Іўі прайшло выязднае пасяджэнне калегіі апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў

**Падчас яго разглядаліся пытанні аб рабоце мясцовых выканаўчых органаў улады Гродзенскай вобласці па забеспячэнні выканання рэлігійнымі арганізацыямі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» і рэгуляванні канфесійных адносін. У ім узялі ўдзел намеснікі старшынь і кіраўнікі аддзелаў ідэалагічнай работы і па справах моладзі гарадскіх і раённых выканкамаў Гродзенскай вобласці, кіраўнікі ўпраўленняў ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, члены рабочай групы па развіцці рэлігійнага турызму Міжведамаснага экспертна-кансультатыўнага савета па турызме пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

«Штогод мы выязджаем у рэгіёны, каб на месцах паглядзець, як праводзіцца работа па выкананні Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, каб разумець, якія ёсць праблемы, якія пытанні неабходна вырашаць. Гэта вельмі актуальна ў гэтым годзе, паколькі ўступае ў сілу новы Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Напярэдзе перарэгістрацыя рэлігійных арганізацый», — заўважыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** Ён падкрэсліў, што забеспячэнне згоды паміж прадстаўнікамі розных канфесій — адна з найважнейшых задач улады. Работа Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў вядзецца з улікам спецыфікі кожнага рэгіёна. Менавіта такі падыход дазваляе захоўваць адзінства.

**Намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Сяргей ГЕРАСІМЕНЯ** нагадаў, што на ІўеўскайзямлІ захоўваецца спадчына многіх народаў, а разам з тым і іх унікальная здольнасць жыць і ствараць плячо ў плячо, суперажываць, супрацоўнічаць, паважаць меркаванні суседзяў, іх традыцыі і абрады. Ён заўважыў, што невыпадкова ў пасяджэнні бяруць удзел члены рэспубліканскай групы па развіцці рэлігійнага турызму Міжведамаснага экспертна-кансультатыўнага савета па турызме пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Унікальныя мясціны, гісторыя і культура якіх паказваюць міжканфесійную разнастайнасць, важна ўключаць у новыя турыстычныя маршруты.

Асобна Сяргей Герасіменя спыніўся на рабоце, накіраванай на дасягненне міжканфесійнага і міжнацыянальнага міру і спакою. Супрацоўнікамі апарату Упаўнаважанага была вывучана этнаканфесійная абстаноўка ў шэрагу раёнаў Гродзенскай вобласці. Пры садзейнічанні галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблваканкама здзейснены выезды ў Смаргонскі, Іўеўскі, Карэліцкі, Гродзенскі раёны і горад Гродна.

Пра работу мясцовых выканаўчых органаў Гродзенскай вобласці па забеспячэнні выканання заканадаўства рэлігійнымі арганізацыямі расказаў **кіраўнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Ігар БУЛАЎКА.** Асаблівасцю Гродзенскага рэгіёна з'яўляюцца яго шматнацыянальнасць, шматканфесійнасць. У вобласці ажыццяўляюць дзейнасць 498 рэлігійных арганізацый. Палітыка, якая рэалізуецца ў дзяржаве, і меры, што прымаюцца на ўзроўні Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і мясцовых органаў улады, дазваляюць захоўваць этнаканфесійную сітуацыю ў вобласці стабільнай і прагназавальнай. Сярод кірункаў работы, якія ажыццяўляюць святары, — выхаванне, асвета, патрыятычныя праекты. У 2023—2024 гадах у Гродзенскай вобласці дзейнічала 391 нядзельная школа розных канфесій, дзе навучалася больш як 12 тысяч дзяцей. Прычым колькасць такіх школ значна павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам. Святары наведваюць мерапрыемствы, прысвечаныя дзяржаўным святам, памятныя акцыі, мітынгі. За паўтара апошніх года пры падтрымцы і ўзгадненні з органамі ўлады рэлігійныя арганізацыі вобласці правялі больш як 30 масавых мерапрыемстваў і хросных хадоў.

У мэтах падтрымкі канфесійнай стабільнасці і міжканфесійнай згоды гарвыканкамы, прадпрыемствы і ўстановы вобласці аказваюць дапамогу рэлігійным арганізацыям у правядзенні мерапрыемстваў, а таксама выдзяляюць фінансавыя сродкі, тэхніку, будматэрыялы, выконваюць будаўнічыя работы. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі «Аб зацвярджэнні дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2024 год» у аграгарадку Жыровічы Слонімскага раёна здзяйсняюцца рэканструкцыя і рэстаўрацыя аб'ектаў Жыровіцкага манастыра. Падрыхтаваны дакументы для будаўніцтва культавых будынкаў у Гродне і Астраўцы і аграгарадку Жыровічы. У стадыі будаўніцтва знаходзіцца 31 храм.

У вобласці працягваецца рэалізацыя пагаднення аб супрацоўніцтве з Беларускай Праваслаўнай царквой і абласная праграма мер, накіраваных на захаванне і развіццё традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў. Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў яе рамках, закранаюць розныя сферы: культуры, адукацыі, аховы здароўя, творчай дзейнасці.

Вялікая работа вядзецца па папулярызацыі аб'ектаў рэлігійнага турызму. Распрацавана звыш 140 культурна-пазнавальных маршрутаў, у якія ўключаны 123 культавыя аб'екты. Вялікай папулярнасцю сярод турыстаў і паломнікаў карыстаюцца Жыровіцкі манастыр, цікавіць іх і царква Архангела Міхаіла ў вёсцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна, касцёл Прасвятой Троіцы ў Гервятах Астравецкага раёна.

Дзякуючы ўзаемадзеянню з праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі ўдаецца зрабіць больш разнастайнымі турыстычныя маршруты, папоўніць іх новымі аб'ектамі, наладзіць экскурсійнае абслугоўванне і зрабіць рэлігійныя аб'екты адкрытымі для кожнага.

**Старшыня Іўеўскага райвыканкама Ігар ГЕНЕЦ** адзначыў: «Ні адзін раён рэспублікі не можа пахваліцца, што на працягу больш як шасці стагоддзяў 625 гадоў у міры і згодзе на яго тэрыторыі пражываюць мусульмане, каталікі, праваслаўныя, іўдзеі». Дарэчы, менавіта Іўеўшчына стала першым месцам пасялення татар. Сёння па колькасці прадстаўнікоў гэтай дыяспары Іўе саступае толькі Мінску. Мясцовую мячэць наведваюць 470 мусульман. Пабудавана яна ў 1882 годзе і з таго часу ніколі не зачынялася, працавала і ў гады савецкай улады, і калі гітлераўцы акупавалі горад. Дарэчы, ніхто з мясцовых мусульман не пайшоў служыць ворагу.

У Іўі асаблівая ўвага аддаецца ўшанаванню і вяртанню імён герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Памяць пра гэтыя старонкі ў жыцці краіны адлюстравана ў 65 абеліскаў і мемарыялах, якія размешчаны на тэрыторыі раёна. Удзельнікі пасяджэння ўсклалі кветкі да памятнага знака ў гонар землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Іўі, а таксама наведалі памятны знак «У гонар сяброўства і згоды канфесій Іўеўшчыны».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Добрая навіна

# Новая «Перамога»

## У Мінску завяршылася рэканструкцыя легендарнага кінатэатра

**За больш чым 70 гадоў «Перамога» бачыла нямала прэм'ер і першых спатканняў — нядзіўна, што з гэтым кінатэатрам у наведвальнікаў звязана шмат добрых успамінаў. Яго будынак уключаны ў Спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, ува сабляе эстэтыку сталінскага ампіру. Цяпер — гэта вялікі мультыкомплекс з пяццю кіназаламі, зручнымі крэсламі і канапамі. У самай вялікай зале адначасова могуць размясціцца 184 гледачы, у тым ліку абсталяваны месцы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Акрамя таго, у будынку ёсць бар. Карэспандэнты «Звязды» ў ліку першых наведалі абноўлены кінатэатр.**

Фота БелТА.

### ХРАМ, КЛУБ, РУІНЫ...

У XVII стагоддзі на месцы, дзе цяпер кінатэатр, з'явіўся каменны касцёл святога Войцэха і манастыр бенедыктынак у стылі высокага барока. Пасля паражэння паўстання 1863—1864 гадоў рэлігійныя аб'екты перадалі Рускай праваслаўнай царкве. У іх сценах адкрылі Прэабражэнскі манастыр. Цікава, што да гэтага моманту вуліца называлася Турэмнай, паколькі яна злучала горад з турэмным замкам. Але ў 1882 годзе па ініцыятыве жыхароў яе перайменавалі ў Прэабражэнскую.

Чарговыя пераўтварэнні адбыліся з прыходам савецкай улады. У пачатку 1920-х гадоў манастыр быў ліквідаваны. Былы праваслаўны храм стаў выкарыстоўвацца як Клуб харчавікоў, а астатнія пабудовы былі разабраны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецкія захопнікі выкарыстоўвалі будынак як салдацкі клуб, ён потым аказаўся паўразбураны з-за выбуху ў суседнім будынку. Засталіся толькі сцены.

На руінах былога клуба вырашылі пабудаваць кінатэатр. Адкрыццё «Перамогі» адбылося ў 1950 годзе. Тады тут было дзве залы: на 600 і 190 месцаў. Упершыню ў Мінску ў кінатэатры абсталявалі шырокі экран. А пазней з'явілася і летняя зала.

Праект Міхаіла Бакланава і Іосіфа Лангбарда, вядомага па Доме ўрада і Оперным тэатры, адлюстроўваў эстэтыку сталінскага ампіру. У архітэктуры, фасадах і інтэр'ерах выкарыстоўвалі элементы класіцызму. Цэнтральная частка галоўнага фасада была зроблена ў выглядзе манументальнага чатырохкалоннага порціка з даданнем вялікага ганка.

Старэйшы мінскі кінатэатр закрылі на рэканструкцыю яшчэ ў 2017 годзе, работы пачаліся ў 2022 годзе. І практычна адразу будаўнікі пад гіпсакардонам знайшлі жывапіс, датаваны 1990 годам. Неўзабаве знайшліся і аўтары: мастакі Раман Заслонаў, Вячаслаў Лемачка і скульптар Яўген Колчаў. «Да нас звярнуўся тагачасны дырэктар «Перамогі». Была задача напісаць што-небудзь на тэму Перамогі, каб пераклікалася з назвай кінатэатра, — распавёў Раман Заслонаў. — Не хацелася выкарыстоўваць нейкі банальны вобраз, сталі шукаць новыя сюжэтныя варыянты. Накідвалі эскізы, малявалі нават грэчаскія перамогі. У выніку вырашылі выканаць фрэску ў стылі сармацкага партрэта, які блізкі да беларускай гісторыі. Яго сюжэт — вяртанне з вайны». Роспіс падчас рэканструкцыі дэманціравалі, але некалькі фрагментаў вырашылі захаваць.

### МЕСЦА СПАТКАННЯЎ, ААЗІС КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

«Гэта сапраўды вельмі прыемная і знамянальная падзея, — сказаў **памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па горадзе Мінску Юрый ФРАЛОЎ.** — Пасля доўгіх гадоў пуставання мы адкрываем рэканструяваны кінатэатр «Перамога». Я думаю, што гэта будзе вельмі важнае і патрэбнае месца для жыхароў і гасцей сталіцы. Гэта тое месца, дзе можна правесці час з карысцю разам з блізкімі».

У будынку ўстанавілі новы дах, замянілі вокны, абнавілі камунікацыі, узмацнілі падмурак. Дарэчы, «Перамога» захавае сваё гістарычнае аблічча: набылі ранейшы выгляд фасад, цэнтральны хол, адноўлены пано, дэкаратыўная ляпніна, мазаічныя падлогі.

«Кінатэатр «Перамога» сапраўды легендарны, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ.** — Ён быў пабудаваны ў кароткія тэрміны. Кінатэатр адкрылі ў 1950 годзе, яму далі высокую назву «Перамога». І гэта было вельмі сімвалічна. У кінатэатры, які быў месцам сустрэч для сотняў тысяч людзей, прызначалі спатканні; сюды прыходзілі людзі, каб акунуцца ў свет кіно. Тады яшчэ не было інтэрнэту, а найважнейшым з мастацтваў было кіно. Людзі адпачывалі, весяліліся, развіваліся. Сёння мы можам з упэўненасцю сказаць, што гэты легендарны кінатэатр ізноў у страі. Я думаю, тысячы людзей з задавальненнем прыйдуць сюды, каб паглядзець фільм, адпачыць, сустрэцца адно з адным. Хацелася б, каб было шмат добрых і цікавых фільмаў, каб людзі сапраўды атрымлівалі камфорт і задавальненне ад знаходжання тут, каб гэтая высокая і вядомая для ўсяго горада назва «Перамога» заставалася заўсёды».

Кожная з пяці зал выканана ў пэўнай тэматыцы. Уваходная група афармлена ў класічным стылі. Адну з зал упрыгожвае вялікая жырандоля. У інтэр'еры захаваны паўкруглыя фрэскі, якія знайшлі пад скляпеннямі пасля дэмантажу адной з перагародак.

**Генеральны дырэктар ААТ «Будтрэст № 1» Уладзімір БУБЛІК** павіншаваў усіх прысутных з заканчэннем рэканструкцыі кінатэатра, пажадаў будучым гаспадарам удалых кінапрэм'ер. «Я жадаю, каб гэты аб'ект аднавіў сваю папулярнасць, прыцягваў людзей і стаў аазісам культурнага жыцця, паспяховым у камерцыйным плане», — акцэнтаваў ён.

У пятніцу тут працавалі тэматычная выстава і фотазона, прысвечаная гісторыі кіно. Усе ахвотныя пазнаёміліся з канцэпцыяй і заламі сучаснага кінатэатра. На другім паверсе кінатэатра працуе фотавыстава, прысвечаная гісторыі горада Мінска. Пасля знаёмства з абноўленым кінатэатрам гасцей запрасілі ў кіназалу для прагляду фільма. Увазе гледачоў была прадстаўлена кінастужка аб унікальнай аперацыі беларускіх партызан «Час вярнуцца». Для масавага гледача кінатэатр адчыніць свае дзверы ў пачатку жніўня.

«Сёння мы завяршылі рэканструкцыю кінатэатра «Перамога», — распавёў **генеральны дырэктар УП «Кінавідэапракат» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ.** — У хуткім часе гледачы змогуць наведаць кінатэатр, які сапраўды вельмі моцна змяніўся. Ён калісьці быў і двухзальны, і адназальны. Сёння ж у ім налічваецца пяць кіназал: вялікая зала на 184 месцы, зала на 48, зала на 24 месцы і дзве залы па 12 месцаў. Тут можна будзе ўбачыць разнастайную палітру фільмаў, і мы робім вялікую стаўку на кінатэатр. Спадзяемся, што тут будзе кіпець сапраўднае фестывальнае жыццё».

Паводле яго слоў, кавярня пры кінатэатры зможа парадаваць не толькі гледачоў, але і гасцей і жыхароў сталіцы. Акрамя таго, тут будуць працаваць два бары з разнастайным асартыментам, у тым ліку з некаторай прадукцыяй уласнай вытворчасці.

«Спадзяемся, што гэта будзе цікавы кінатэатр, які палюбяць мінчане, — дадаў Уладзімір Карачэўскі. — Я хацеў бы падзякаваць нашай дзяржаве, Прэзідэнту, краіне за падтрымку культуры, за стварэнне ўмоў для жыцця людзей. Справядліва кажуць, што Беларусь — гэта краіна для жыцця, краіна для людзей. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца аднаўленне выдатнага кінатэатра «Перамога». Хоць гэта гістарычны аб'ект, ён па-новаму паўстане для гледачоў. Сёння мы падрыхтавалі выдатны праект, які носіць сімвалічную назву «Час вярнуцца». І сапраўды для мінчан і гасцей сталіцы прыйшоў час вярнуцца ў кінатэатр «Перамога».

Фільм «Час вярнуцца» прысвечаны вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Таму з Перамогай нас усіх! Глядзіце добрае кіно ў кінатэатры «Перамога», — запрашае мінчан і гасцей сталіцы Уладзімір Карачэўскі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**